# Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы.
# Устаўныя канструкцыі

**А. М. Власавец,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Пінска

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу

**Мэты:**

- дапамагчы вучням асэнсаваць асаблівасці сказаў з пабочнымі словамі, словазлучэннямі і сказамі, устаўнымі канструкцыямі;
- стварыць умовы для вывучэння пабочных слоў;
- выпрацоўваць уменні і навыкі знаходзіць у тэкстах сказы з пабочнымі словамі, словазлучэннямі і сказамі, устаўнымі канструкцыямі, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку;
- на прыкладзе ўжывання слоў „калі ласка" паказаць лепшыя рысы нашага народа.

**Абсталяванне:** З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8-га класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мінск: НІА, 2015; табліца „Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы. Устаўныя канструкцыі", карткі з тэставым заданнем.

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант**

**Стварэнне псіхалагічнага настрою**

**Настаўнік.** Ёсць у нашай мове вельмі прыгожы, чыста беларускі выраз – „калі ласка". У ім выяўляюцца лепшыя рысы характару нашага народа: шырыня душы,

дабрыня, спагадлівасць, тактоўнасць. Нездарма ж украінскага паэта Алексу Юшчанку так зачаравалі гэтыя словы, што ён прысвяціў ім цэлы верш, які так і назваў „Калі ласка”.

*Калі ласка, калі ласка…*
*Не забуду тыя словы,*
*Словы першыя, што ў Мінску*
*Я пачуў у час размовы…*
*Словы гэтыя, як песню,*
*Слухаў я ў Купалы дома.*
*Я хачу, каб словы тыя*
*На ўвесь свет былі вядомы.*

Пераклад Міколы Аўрамчыка.

- Чаго хоча паэт?
- З якой інтанацыяй будзеце чытаць словы „калі ласка”?

**II. Паведамленне тэмы і мэт урока**

**III. Тлумачэнне новага матэрыялу**

**1. Тлумачэнне матэрыялу** адбываецца з выкарыстаннем табліцы „Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы. Устаўныя канструкцыі”

**2. Работа з падручнікам**. Самастойнае прачытанне матэрыялу § 44 (стар. 208 – 209, 211 і тэкст практ 307) і вызначэнне таго, аб чым не было гаворкі .

**IV. Адпрацоўка і карэкцыя ведаў.**

**1.Работа з тэкстам** ( на картках).

Прачытайце тэкст, захоўваючы арфаэпічныя нормы.

*Вялікдзень – адна з нядзель у перыяд з 4 красавіка па 8 мая (у праваслаўных) і з 22 сакавіка па 25 красавіка ( у католікаў).*

*Вялікдзень ( яго яшчэ называюць Вялічка) – гэта значыць вялікі дзень, доўгі дзень. Відаць, у старажытнасці, яшчэ ў часы язычніцтва, Вялікдзень быў сустрэчай Новага года па сонечным календары і святкаваўся ў дзень вясновага раўнадзенства. Адзначалася свята ў гонар сонца, абуджэння прыроды, набліжэння „вялікіх дзён” палявых работ. Як сведчаць хрысціянскія традыцыі, у гэты дзень ушаноўваецца ўваскрашэнне (паўстанне з мёртвых) Ісуса Хрыста, якое сімвалізуе перамогу жыцця над смерцю, святу над цемрай, дабра над злом* (З газеты).

- Дайце загаловак.

- Вызначце асноўную думку.

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

- Зрабіце сінтаксічны разбор сказа з пабочным словам. Вызначце ролю пабочнага слова ў тэксце.

**2. Работа з вучэбным дапаможнікам.**

Прачытайце лінгвістычны матэрыял аб тым, што некаторыя словы могуць выступаць як у ролі члена сказа ці сродку сувязі ў сказе, так і ў ролі пабочнага слова (стар. 212 – 213).

**3. Выкананне практыкавання** 311 (па варыянтах).

Выпісаць па тры сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца пабочнымі: I варыянт – са сказаў 1 - 4, II варыянт – са сказаў 5 -7.

**Фізкультхвілінка**

**4. Работа па табліцы** „Устаўныя канструкцыі".

Да пабочных слоў, словазлучэнняў і сказаў прымыкаюць устаўныя канструкцыі. Яны ўтрымліваюць дадатковыя заўвагі, удакладненні і тлумачэнні, на пісьме выдзяляюцца працяжнікамі або бяруцца ў дужкі.

**5. Зварот** да лінгвістычнага матэрыялу падручніка на старонцы 216.

**6. Выкананне практыкавання** 317.

Выпісаць сказы з устаўнымі канструкцыямі, паставіць неабходныя знакі прыпынку, абгрунтаваць іх пастаноўку.

**7.Хвілінка кемлівасці**

Пабудуйце разбураны верш Мар'яна Дуксы з пяці радкоў.

***Заснежаныя ягады***

*Прырода іх чамусьці зберагла* (1)

*ад восеньскага шчодрага стала,* (3)

*у лесе засталіся.* (5)

*(з прычыны той, што лішнімі здаліся?)* (2)

*каб зімаваць* (4)

Вы лічыце, што ў гэтым вершы ёсць: а) пабочныя словы; б) пабочнае словазлучэнне; в) пабочны сказ; г) устаўная канструкцыя. Абгрунтуйце сваё сцвярджэнне.

- Назавіце словы, у якіх назіраецца характэрная асаблівасць беларускай фанетыкі – ужываецца зацвярдзелы зычны .. ( [***ч***] ).
- Завучыце верш і запішыце па памяці.

**V. Падагульненне**

**Тэставае заданне**

А.Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы трэба выдзеліць коскамі.

1.Зімою мы *несумненна* правядзём лыжныя спаборніцтвы.

2. За акном *відаць* было, як згіналіся ад ветру верхавіны дрэў.

3. Ён *відаць* заблудзіўся ў гэтым дрымучым лесе.

4. Максім Багдановіч *напрыклад* нарадзіўся ў сям'і вучонага-этнографа ў горадзе Мінску, а жыў далёка за яго межамі.

5. Цягнік *здалося нам* спыніўся на месцы.

Б.Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам спалучэнні з'яўляюцца ўстаўнымі канструкцыямі.

1. Возера паілі крыніцы *яны нябачна білі з дна*, таму вада была такая празрыстая і так мала награвалася.

2. Тут бульба *як гаворыцца ў народзе* з'яўляецца другім хлебам.

3. Мы пазналі без памылкі *выдаў шэлест цемнаты*, што прывезлі нам пасылкі, тэлеграмы і лісты.

4. Каля Нёмана *а ён быў тут зусім блізка* пачулася Якубава песня.

5. Горад *як мне казалі* знаходзіўся дзесьці на ўсход ад нашай вёскі.

Адказ : А - 1, 3, 4, 5 ; Б – 1, 3, 4.

**VII. Рэфлексія**

У пачатку ўрока мы з вамі пачалі сеяць зярняткі ведаў. Ахарактарызуйце, на якой „стадыі росту" знаходзяцца вашы „веды-зярняткі":

1) ляжу ў глебе;

2) стаў прарастаць;

3) узышоў;

4) вырас;

5) закаласіўся.